№10 (202)
Лістапад 2006

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## «Верым! Можам! Пераможам!»

*— пад такой назвай выйшаў дакументальна-публіцыстычны зборнік матэрыялаў, прысьвечаных сёлетнім сакавіцкім падзеям у Беларусі.*




Зборнік “Верым! Можам! Пераможам!” – гэта кніга пра змаганьне, пра прагу пераменаў. Гэта спроба захаваць для гісторыі невялікі, але досыць важкі прамежак часу, калі беларускі народ зьяднаўся і прадэманстраваў жаданьне “людзьмі звацца”. Гэта таксама спроба адлюстраваць агульную карціну рэчаіснасьці вясны 2006 году, складзеную з асобных гісторыяў, падзеяў і фактаў. Гэта спроба данесьці да беларусаў тую праўду, якую замоўчваюць афіцыйныя крыніцы, праўду, якой улады баяцца.

Незаконнасьць удзелу ў выбарах Аляксандра Лукашэнкі, масавыя рэпрэсіі падчас выбарчай кампаніі напружылі атмасферу ў грамадстве і падштурхнулі дэмакратычна настроеных грамадзянаў да правядзеньня шырокіх акцыяў пратэсту. Яны не прывялі да зьвяржэньня рэжыму, аднак крок да набліжэньня канца дыктатуры ў краіне быў зроблены: у Беларусі стала модным быць свабодным. “Зьмены прыйдуць непазьбежна, і гэта толькі справа часу. Беларускія грамадзяне, асабліва наша моладзь, хочуць жыць у дэмакратычным грамадстве, дзе б шанаваліся правы кожнага чалавека, і дзе б урэшце запанавала сапраўдная СВАБОДА,” – сьцьвярджае ва ўступе да кнігі праваабаронца Алесь Бяляцкі.

Сярод аўтараў зборніку – непасрэдныя ўдзельнікі сакавіцкіх падзеяў, журналісты, грамадзка-палітычныя дзеячы, якія прайшлі праз судовы “канвеер” і адседзелі “суткі”. Асноўную частку выданьня складаюць арыгінальныя матэрыялы, выкарыстаныя таксама фотаздымкі і публікацыі з незалежных СМІ.

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*




*Сяргей Скрабец – дома. Сустрэча з дачкою.*

# Сяргей Скрабец — на волі

У ноч з 14 на 15 лістапада з калоніі “Віцьба-3” на свабоду выйшаў былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў, сябра дэпутацкай групы “Рэспубліка” Сяргей Скрабец.

Ад 20 кастрычніка разам з былым кандыдатам на пасаду прэзідэнта Аляксандрам Казуліным Сяргей Скрабец праводзіў галадоўку пратэсту. С. Скрабец заявіў, што А. Казулін працягвае галадоўку.

Паводле С.Скрабца, сп. Казулін страціў каля 17 кілаграмаў і вельмі аслабеў фізічна. Адміністрацыя калоніі асьцерагаецца, каб яго ня бачылі, і ўгаворвае спыніць галадоўку. Перад вызваленьнем Аляксандр Казулін даручыў Сяргею Скрабцу выказвацца ад яго імя і працягваць яго працу.

Сяргей Скрабец заявіў, што паўтары гады зьняволеньня былі часам зьнявагі і прыніжэньня, “павадзілі тварам па асфальце, як хацелі”. Спадар Скрабец заявіў, што вынес усё нармальна і знаходзіцца ў добрым настроі. Ён прадчуваў, што вызваляць з турмы ўначы, каб не дапусьціць урачыстай сустрэчы.

Аляксандр Скрабец, малодшы брат кіраўніка дэпутацкай групы “Рэспубліка” ў Палаце прадстаўнікоў папярэдняга скліканьня, забіраў экс-парламентара з папраўчай калоніі. І першае, пра што яго папрасіў старэйшы брат, — набыць SIM-карту для мабільнага тэлефону:

— Я думаў, што Сяргей будзе адпачываць хаця б тыдзень-другі. Да таго ж мы прыехалі у Менск а палове шостай раніцы. Але нават у такіх умовах брат дазволіў сабе перадыхнуць толькі да дванаццаці гадзінаў. А потым, як ён мне сказаў, “пачынаю палітработу”.

Аляксандр Скрабец паведаміў, што пры выхадзе з калоніі ў Сяргея ўзьнік канфлікт з начальствам папраўчай установы. Тыя наадрэз адмовіліся аддаць Сяргею Скрабцу запісы, якія ён вёў там. І тады Сяргей сказаў: паліце іх. Так і зрабілі — на нашых вачах дзёньнікі брата спалілі.

16 лістапада прайшла прэс-канферэнцыя Сяргея Скрабца.

Спадар Скрабец заўважыў, што канферэнцыю папрасіў правесьці яго сябра, былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Аляксандр Казулін. Сяргей Скрабец пацьвердзіў, што Казулін працягвае галадоўку і вылучае наступныя патрабаваньні:

— пастаноўка пытаньня аб сітуацыі ў Беларусі ў Савеце бясьпекі ААН.

— рэальнае аб’яднаньне дэмакратычных сілаў Беларусі.

Ад пераводу ў санчастку Казулін адмовіўся. Бо гэта тычыцца даверу лекарам, якога, на жаль, няма.

Сяргей Скрабец непакоіцца, што Аляксандра Казуліна могуць паспрабаваць вывесьці з галадоўкі прымусова: увядзеньнем вадкай ежы і кропельніцай. Тым больш, што праваахоўнікі сьцьвярджалі, што досьвед такі ў іх ёсьць. А гэтыя дзеяньні могуць прывесьці да сьмерці. “Я ўсур’ёз непакоюся за яго жыцьцё,” — сказаў журналістам Скрабец.

Па словах Скрабца, у нашай краіне назіраецца новая хваля інфармацыйнай блакады. Асабліва гэта відавочна ў турме:

— Пакуль не было Казуліна ў калоніі, я жыў у дастаткова добрых умовах. Калі прывезьлі Казуліна,

(Працяг на стар. 7)

# Астатніх здымуць падчас рэгістрацыі?

**Адмова ў рэгістрацыі ініцыятыўных групаў апазіцыянераў – апрабаваны метад беларускіх уладаў**

9 лістапада скончыўся тэрмін падачы заявак на рэгістрацыю ініцыятыўных групаў кандыдатаў у дэпутаты на мясцовыя выбары. Па папярэдніх падліках, аб'яднаныя дэмакратычныя сілы Беларусі вылучылі каля тысячы кандыдатаў у дэпутаты шляхам збору подпісаў. Аднак, далёка ня ўсе ініцыятыўныя групы змаглі атрымаць рэгістрацыю. Напрыклад, на Астравеччыне не зарэгістравалі 4 ініцыятыўныя групы прадстаўнікоў грамадзка-палітычнага руху: сябра АГП Івана Жылецкага, сябра АГП Міколы Уласевіча, прадпрымальніцы Алы Віткоўскай і Алены Бей.

Сітуацыю каментуе юрыст Уладзімер Лабковіч: "Зразумела, што ўлады выкарыстоўваюць тую практыку, якую яны вельмі пасьпяхова праводзілі падчас мінулых парламенцкіх выбараў, калі па абсалютна надуманых прычынах не рэгістравалі моцных апазіцыйных кандыдатаў. Гэтым разам, напрыклад, атрымалі адмову ў рэгістрацыі ініцыятыўных групаў вядомыя грамадзка-палітычныя лідэры Анатоль Лябедзька, Аляксандр Бухвостаў, Генадзь Фядыніч, Яраслаў Раманчук, Алесь Чыгір і іншыя. І механізмаў тут шмат. Вельмі часта выкарыстоўваецца метад узяцьця ў закладнікі сябраў ініцыятыўных групаў, калі іх запалохваюць пазбаўленьнем працы, аказваюць псіхалагічны ціск. А пасьля на падставе пятага артыкулу Выбарчага кодэксу, які камісіі трактуюць такім чынам, што згодна з ім, калі ад збору подпісаў адмаўляецца адзін з сяброў пададзенай на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы, не рэгіструецца ўся група. Да таго ж улады маюць цалкам падкантрольныя выбарчыя камісіі, якія могуць прымаць любыя рашэньні ў дачыненьні да апазіцыйных кандыдатаў.

Я мяркую, што на этапе рэгістрацыі амаль усе дэмакратычныя кандыдаты будуць па розных прычынах зьнятыя з перадвыбарчай гонкі, бо працэс праверкі подпісаў немагчыма пракантраляваць, а ўлічваючы практыку мінулых выбараў, абскарджаньне адмовы ў рэгістрацыі ў судзе не прыводзіць да аднаўленьня рэгістрацыі".

# Са сваім бланкам і ручкай...

***Улады чыняць перашкоды для рэгістрацыі ініцыятыўных групаў па зборы подпісаў для вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты.***

4 лістапада актывіст апазіцыі Уладзімір Навасяд падаў заяву на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў для вылучэньня кандыдатам у дэпутаты Менскага гарадзкога савету па Серабранскай выбарчай акрузе № 11. На працягу гадзіны пасьля падачы заявы ўсім сябрам ініцыятыўнай групы Навасяда патэлефанавалі з тэрытарыяльнай камісіі і пацікавіліся, "ці добраахвотна яны ўвайшлі ў ініцыятыўную групу і ці разумеюць яны адказнасьць дадзенага кроку".

"Сёньня я быў зьдзіўлены, што ў камісіі не знайшлося бланкаў заяваў на рэгістрацыю ініцыятыўных групаў. Але беларусы прывучаныя ў паліклініку ісьці са сваімі шпрыцамі, у шпіталь класьціся са сваімі лыжкамі і талеркамі, таму і ў камісію я прыйшоў са сваім бланкам і ручкай. Спадзяюся, гэта ня будзе ўспрынята як выкарыстаньне нямэтавых сродкаў, і мне не адмовяць у рэгістрацыі групы", – так Уладзімір Навасяд пракаментаваў сітуацыю прэс-службе Хартыі-97.

Лідэр аб'яднанай гармадзянскай партыі (АГП) Анатоль Лябедзька ня змог зарэгістраваць ініцыятыўную групу па вылучэньні яго кандыдатам у дэпутаты Менгарсавету.

Як паведаміў БелаПАН намесьнік старшыні партыі Ігар Шынкарык, палітык зьбіраўся балатавацца па Адзінцоўскай выбарчай акрузе. Аднак дакументы на рэгістрацыю тэрытарыяльная камісія не прыняла. Справа ў тым, што камісія працавала 5, 8 і 9 лістапада. Аднак у гэтыя дні А.Лябедзька знаходзіўся за мяжой. Сьпісы ініцыятыўнай групы спрабаваў зарэгістраваць І.Шынкарык, але ў камісіі яму заявілі, што для рэгістрацыі неабходная прысутнасьць асобы, якая зьбіраецца балатавацца ў Менгарсавет. У выніку па Адзінцоўскай акрузе будзе спрабаваць прабіцца ў гарадзкі савет сын палітыка Арцём Лябедзька.

У самога лідэра АГП засталася толькі адна магчымасьць прыняць удзел у выбарах – вылучыцца ад партыі. Верагодней за ўсё, ён будзе балатавацца па Куйбышаўскай выбарчай акрузе, дзе разьмешчаная штаб-кватэра АГП. У гэтай акрузе ўжо зарэгістраваў сваю ініцыятыўную групу лідэр Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін, а таксама мае намер балатавацца намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч.



Фота byMedia.net

*Аляксандр Мілінкевіч у адміністрацыі Ленінскага раёну г. Бабруйску завярае подпісы, сабраныя на вылучэньне дэмакратычных актывістаў кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых саветаў. Бабруйск, 14 лістапада 2006 г.*

# Пад пагрозай адлічэньня з ВНУ

Лідэрам незалежнага прафсаюзнага руху Беларусі Аляксандру Бухвоставу і Генадзю Фядынічу адмоўлена ў рэгістрацыі ініцыятыўных групаў для збору подпісаў у падтрымку іх вылучэньня кандыдатамі ў дэпутаты Менскага гарадзкога савету. Як паведаміў Аляксандр Бухвостаў, які спрабаваў балатавацца па Аўтазаводзкай акрузе, падставай для адмовы ў рэгістрацыі сталі заявы некалькіх чальцоў ініцыятыўнай групы аб тым, што яны не давалі сваёй згоды на ўключэньне ў яе склад. Паводле Бухвостава, гэта студэнты сталічных ВНУ, якія былі вымушаныя напісаць заявы пад пагрозай адлічэньня. Аналагічная сітуацыя склалася і ў Генадзя Фядыніча, які падаваў дакументы на рэгістрацыю па Убарэвіцкай выбарчай акрузе. Прафсаюзны лідэр лічыць, што ўлады мэтанакіравана "выкідаюць" з выбарчай кампаніі "ключавыя фігуры дэмакратычнага руху".

# Далей да самаізаляцыі

## Беларускія ўлады не пусьцілі на IX Менскі форум дэпутатаў Бундэстагу і рабочую групу Еўрапарламенту

Прэс-служба Партыі БНФ паведаміла, што менскія ўлады ня выдалі ўязных візаў тром дэпутатам Еўрапейскага Парламенту (ЕП) і двум дэпутатам Бундэстагу, запрошаным на Менскі форум, што адбываўся 9-11 лістапада. Форум ужо ў дзявяты раз ладзіць амбасада Нямеччыны разам з нямецкімі няўрадавымі арганізацыямі. Ён павінен служыць "дыялогу прадстаўнікоў ураду Беларусі, беларускіх партыяў і грамадзкасьці".

Сёлетні Форум прысьвечаны тэме "Беларусь — суседзтва і транзіт у Еўропе — замежная палітыка, эканоміка і грамадзтва". На яго запрошаныя нямецкія і беларускія службоўцы, навукоўцы, дэпутаты Бундэстагу, еўрапейскія службоўцы, а таксама дэпутаты Еўрапейскага парламенту з розных краінаў, якія ўваходзяць у сьпецыяльную трохасабовую Рабочую групу Дэлегацыі ЕП для дачыненьняў зь Беларусьсю. Групу накіравала Канферэнцыя старшыняў ЕП, на чале яе меў быць намесьнік старшыні Дэлегацыі мальтыйскі еўрадэпутат Джозэф Мускат.

Старшыня БНФ Вінцук Вячорка так камэнтуе сітуацыю: "Супрацоўнік Генеральнага дырэктарату замежнай палітыкі Еўрапейскага Парламенту сп. Арнольдас Пранцкявічус, адказны за прыезд Рабочай групы, папрасіў мяне пра сьпецыяльную сустрэчу групы з лідэрамі аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Мы дамовіліся на суботу. Аднак 3 лістапада сп.А.Пранцкявічус напісаў мне, што афіцыйны Менск адмовіўся даць візы тром дэпутатам Еўрапейскага Парламенту, якія складалі Рабочую групу Дэлегацыі ЕП для дачыненьняў з Беларусьсю, і яму самому. Паводле А.Пранцкявічуса, фармальнай прычынай адмовы стала тое, што ўлады разглядаюць Менскі Форум як строга двухбаковае беларуска-германскае мерапрыемства без удзелу ў ім еўрапейскага кампаненту і, такім чынам, Еўрапейскага Парламенту.

Сп. Пранцкявічус нагадаў дыпламатам ад афіцыйнага Менску, што першае паседжаньне форуму "Беларусь — суседства і транзіт у Еўропе — замежная палітыка, эканоміка і грамадзтва" цалкам прысьвечанае менавіта супрацы з ЕС, а сярод дакладчыкаў прадстаўнікі ня толькі Беларусі і Германіі, але таксама Палітычнага дэпартаменту Высокага прадстаўніка ў пытаньнях замежнай палітыкі ЕС, Дэлегацыі Еўрапейскай камісіі ў Кіеве, АБСЕ, МЗС Літвы, Расіі і Украіны і інш. Аднак дыпламаты пацьвердзілі, што ўдзел Еўрапейскага Парламенту ў гэтай падзеі немагчымы.

А.Пранцкявічус паведаміў, што і два дэпутаты Германскага Бундэстагу, запрошаныя да ўдзелу ў Менскім форуме, таксама не атрымалі візаў. Такім чынам, аргументацыя ўладаў наконт строга двухбаковага характару форуму, пра які яны нібыта дбаюць, беспадстаўная, лічыць ён. Сп. Пранцкявічус выказаў асаблівае шкадаваньне, што не адбудзецца запланаванае сустрэчы Рабочае групы з лідэрамі беларускіх дэмакратычных сілаў.

Я, са свайго боку, таксама шкадую пра страту магчымасьці сустрэцца зь сябрамі свабоднай Беларусі на беларускай зямлі. Лукашэнкаўкая ўлада насуперак любой палітычнай логіцы сама заганяе сябе ў тупік самаізаляцыі — і гэта напярэдадні вельмі сур'ёзных энергетычных праблемаў. Яшчэ раз паўтараю: віну за непазьбежны будучы энергетычны крызіс нясе Лукашэнка і ягоная палітыка аднабаковай арыентацыі на Расею. Усе падзеі апошніх дзён — прысуд З.Дашкевічу, арышты актывістаў БНФ у рэгіёнах, вось гэтая адмова ў візах — паказваюць, што адкрываць Беларусь для сьвету праз дэмакратычныя зьмены ён ня мае намеру. Толькі прыход да ўлады дэмакратычных сілаў уратуе нашую эканоміку і нашую краіну".

## Вярнуць Беларусь на цывілізаваны шлях разьвіцьця

**У Менску прайшла сустрэча лідэра дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандра Мілінкевіча з генеральным сакратаром партыі ХДС Рональдам Пофалам.**

**Як адзначыў лідэр дэмсілаў Беларусі, генеральны сакратар партыі ХДС прыехаў у Менск з пасланьнем, сутнасьць якога ў тым, што Еўропа застаецца адкрытай для супрацоўніцтва з Беларусьсю, але толькі пры выкананьні канкрэтных умоваў – распачынаньне дэмакратычнага працэсу, стварэньне ўмоваў для правядзеньня свабодных і празрыстых выбараў, вызваленьне палітвязьняў.**

**Аляксандр Мілінкевіч назваў вынікі сустрэчы з Рональдам Пофалам надзвычай важнымі, асабліва беручы пад увагу, тое што Нямеччына з 1 студзеня 2007 году будзе старшыняваць у Еўрасаюзе:**

**— Пазіцыя Германіі ў ацэнцы рэжыму ў Беларусі застаецца нязьменнай. Безумоўна, працэс супрацоўніцтва з Беларусьсю Еўропе можна пачынаць, нават нягледзячы на шматлікія парушэньні правоў чалавека, якія фіксуюцца ў нашай краіне. Але гэты працэс павінна пачаць менавіта беларуская ўлада. Яна павінна паказаць, што гатова вярнуць Беларусь на цывілізаваны шлях разьвіцьця, — адзначыў Аляксандр Мілінкевіч.**

**Генеральны сакратар ХДС перадаў таксама Аляксандру Мілінкевічу асабістыя словы прызнаньня канцлера Германіі Ангелы Меркель. Спадарыня канцлер выказала падтрымку дэмакратычным сілам Беларусі.**

**Разам з лідэрам аб'яднаных дэмакратычных сілаў удзел у сустрэчы брала Ірына Казуліна, жонка палітзьняволенага экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна.**

# Выказалі падтрымку незалежнаму друку

### Удзельнікі IX Менскага форуму накіравалі зварот у Міністэрства сувязі і Міністэрства інфармацыі Беларусі

У сваім лісьце, падпісаным 11 лістапада падчас работы апошняга дня форуму, яны заклікалі міністраў спрыяць узнаўленьню супрацоўніцтва дзяржаўных прадпрыемстваў "Белпошта" і "Саюздрук" (падведамных гэтым міністэрствам) з недзяржаўнымі грамадзка-палітычнымі газетамі.

Гаворка ідзе пра рэспубліканскія і рэгіянальныя незалежныя выданьні, з якімі "Саюздрук" скасаваў у аднабаковым парадку дамовы на распаўсюд праз сваю гандлёвую сетку, а "Белпошта" не ўключае ў падпісныя каталёгі і такім чынам адмаўляецца распаўсюджваць гэтыя газеты шляхам паштовай дастаўкі.

Прапанова дапамагчы незалежнай прэсе адстаяць свае правы на распаўсюджаньне прагучала ад дэпутата Вольгі Абрамавай і некаторых журналістаў-удзельнікаў форуму.

"Свае подпісы пад зваротам паставілі 34 удзельнікі беларуска-нямецкага форуму",— паведаміла прэс-службе БАЖ дэпутат Вольга Абрамава. — Падпісалася прыкладна трэцяя частка ўдзельнікаў гэтага дня форуму."

Нагадаем, на працягу апошніх гадоў дзяржаўныя прадпрыемствы-манапалісты "Белпошта" і "Белсаюздрук" скасавалі дамовы і адмаўляюцца супрацоўнічаць з большасьцю недзяржаўных друкаваных выданьняў грамадзка-палітычнага характару.



*Арышт распаўсюдніка незалежнага друку ў Менску 16 лістапада 2006 г.*

На патрабаваньні рэдакцыяў і чытачоў уключыць газету ў падпісны каталог кіраўніцтва "Белпошты" спасылаецца на тое, што "заканадаўствам не прадугледжаны абавязак па ўключэньні друкаванага выданьня ў каталог", і таму "выбар друкаваных выданьняў для фармаваньня каталогу зьяўляецца правам РУП "Белпошта".

"Саюздрук" у сваіх адказах звычайна матывуе адмову супрацоўнічаць з недзяржаўнымі газетамі эканамічнай нямэтазгоднасьцю.

# Не пусьцілі без тлумачэньняў

Міністэрства замежных справаў Беларусі без тлумачэньня прычынаў адмовіла ў выдачы ўязных візаў замежным журналістам: кіраўніку беларускай рэдакцыі радыё "Нямецкая хваля" Карнэліі Рабітц і нямецкаму журналісту Інгу Петцу. Прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў у інтэрв'ю "Нямецкай хвалі" назваў гэтую меру "вымушанай і сіметрычнай рэакцыяй" на абмежаваньні ў адносінах да Беларусі з боку ЕС, ЗША і іншых краінаў. Ён падкрэсьліў, што ў ліку беларускіх грамадзянаў, якім забаронены ўезд на тэрыторыю ЕС і, у прыватнасьці, ФРГ, прадстаўнікі беларускага парламенту і СМІ.

Варта адзначыць, што гэта далёка ня першы выпадак, калі журналістаў іншых краінаў не пускаюць у Беларусь. Але ў адрозьненьні ад беларускіх уладаў ЕС абнародаваў сьпіс асобаў, якім забаронена знаходзіцца на яго тэрыторыі. Тым часам замежныя грамадзяне і, у прыватнасьці, журналісты, даведваюцца аб тым, што ім не дазволены ўезд у Беларусь у апошні момант альбо нават ужо прыбыўшы на тэрыторыю Беларусі і маючы візу і акрэдытацыю, як гэта адбылося, напрыклад, з польскімі журналістамі.

# Пра міжнародныя стандарты — забудзьце

## Зьмены ў Выбарчым кодэксе РБ аналізуе юрыст Уладзімер ЛАБКОВІЧ

6 кастрычніка ўступілі ў сілу зьмены ў Выбарчым кодэксе Рэспублікі Беларусь, ініцыяваныя Цэнтральнай камісіяй РБ па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Аб тым, што такія зьмены рыхтуюцца, грамадзтву стала вядома ў сярэдзіне верасьня з інтэрв'ю старшыні Цэнтральнай камісіі Лідзіі Ярмошынай газеце “Звязда”. У сваім інтэрв'ю спадарыня Ярмошына спрабавала давесьці, што прапануемыя зьмены вельмі карысныя і, безумоўна, адпавядаюць патрабаваньням міжнародных стандартаў. Праўда, Лідзія Міхайлаўна агучыла толькі некаторыя ініцыятывы.

Падрабязна было расказана аб прапанове адмяніць другі тур пры правядзеньні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў, фактычна — увядзеньні мажарытарнага прынцыпу адноснай большасьці. Таксама была агучаная ініцыятыва, каб назіральнікам мог быць толькі сябра палітычнай партыі ці грамадзкага аб’яднаньня. Яшчэ вельмі ўскосна ўзгадвалася пра зьмены ў Закон “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь”. І ўсё. Іншыя зьмены засталіся таямніцай. Ні адзін з зацікаўленых суб’ектаў ня меў магчымасьці пазнаёміцца з новаўвядзеньнямі ў выбарчым заканадаўстве.

У такой сітуацыі ў незалежных экспертаў і сяброў палітычных партыяў узьніклі апасеньні, што падрыхтаваныя зьмены ўтрымліваюць і іншыя моманты, скіраваныя на пагаршэньне ўмоваў удзелу ў выбарах палітычнай апазіцыі і незалежных кандыдатаў. Ні ў кога не было сумневу, што патрабаваньні міжнародных арганізацыяў і дэмакратычных сілаў Беларусі не прынятыя пад увагу пры падрыхтоўцы зьменаў у Выбарчы кодэкс. Трэба нагадаць, што АБСЕ неаднаразова настойвала на прывядзеньні беларускага выбарчага заканадаўства ў адпаведнасьць з міжнароднымі нормамі. Так, прапаноўвалася пашырыць правы назіральнікаў, гарантаваць наяўнасьць у выбарчых камісіях прадстаўнікоў палітычных партыяў, якія бяруць удзел у выбарах, пашырыць магчымасьці агітацыі для кандыдатаў, дэталізаваць і зрабіць больш празрыстай працэдуру падліку галасоў і г.д. Гэта той мінімум, які патрабаваўся, каб зрабіць хоць маленькі крок у бок набліжэньня беларускіх выбараў да міжнародных стандартаў.

Адным з матываў унясеньня зьменаў Лідзія Ярмошына назвала неабходнасьць прывядзеньня заканадаўства ў адпаведнасьць з практыкай яго прымяненьня. У папярэдніх кампаніі гэта рэгулявалася пастановамі Цэнтральнай камісіі, якія выклікалі вялікае нараканьні з боку незалежных экспертаў, палітычных партыяў і іншых суб’ектаў выбарчага працэсу. Неаднаразова ўказвалася, што пастановы Цэнтральнай камісіі дапаўняюць дзеючае заканадаўства, растлумачваюць прымяненьне нормаў заканадаўства, хоць такой функцыяй Камісія не надзеленая — яна мае права толькі тлумачэньня прымяненьня нормаў права. Такім чынам, слушнасьць нараканьняў прадстаўнікоў грамадзкасьці пацьвердзіла само кіраўніцтва Цэнтральнай камісіі, ускосна прызнаўшы неадпаведнасьць закону сваю ранейшую дзейнасьць у гэтым накірунку.

Тэкст зьменаў у Выбарчы кодэкс стаў вядомы грамадзтву толькі пасьля іх прыняцьця, калі адпаведны закон быў зьмешчаны на афіцыйным сайце Цэнтральнай камісіі.



*Уладзімер ЛАБКОВІЧ*

Трэба адзначыць, што прынятыя зьмены датычаць некалькіх актаў заканадаўства, а менавіта — Закону Рэспублікі Беларусь “Аб прэзідэнце Рэспублікі Беларусь”, “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь” і непасрэдна Выбарчага кодэксу.

### Зьмены і іх наступствы

Прааналізуем гэтыя зьмены і наступствы для ўдзельнікаў выбарчай кампаніі ад іх увядзеньня.

1. Арт.8 Закону “Аб прэзідэнце Рэспублікі Беларусь” у папярэдняй рэдакцыі абмяжоўваў права адной асобы вылучацца больш за два разы на пасаду прэзідэнта краіны. Пасьля рэферэндуму 2004 г., калі па ініцыятыве А.Лукашэнкі былі ўнесеныя зьмены ў арт.81 Канстытуцыі Беларусі, такое абмежаваньне было зьнятае. А.Лукашэнка атрымаў права, вылучацца бясконцую колькасьць разоў. Але ў сьпешцы парламент ня ўнёс неабходныя зьмены ў іншыя законы. Такім чынам, удзел А.Лукашэнкі ў выбарах супярэчыў закону, пры гэтым фармальна адпавядаючы Канстытуцыі. Прадстаўнікі штабоў дэмакратычных кандыдатаў неаднаразова зьвярталі на гэта ўвагу.

2. Зьмены ў арт. арт. 5 і 6 Закону “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь” (паўторана і ў ч. 8 арт. 45 Выбарчага кодэксу) прадугледжваюць, што ў выпадку калі масавае мерапрыемства арганізуецца на падставе арт. 45 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь у мэтах агітацыі за абраньне кандыдата ў дэпутаты ці прэзідэнты, яно праводзіцца са згоды мясцовых органаў улады і рэгулюецца заканадаўствам аб масавых мерапрыемствах. Адзінае палягчэньне ўмоваў арганізацыі і правядзеньня такіх мерапрыемстваў заключаецца ў тым, што заява на мерапрыемства можа быць пададзеная не пазьней за пяць дзён да заяўленага тэрміну, а рашэньне па гэтай заяве можа быць атрыманае на працягу трох дзён з даты рэгістрацыі яе. Гэтая зьмена зьяўляецца своеасаблівым завяршэньнем дыскусіі незалежных юрыстаў з Цэнтральнай камісіяй. Нагадаем асноўны сэнс той “дыскусіі”: незалежныя юрысты сьцьвярджалі, што на масавыя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў межах артыкулу 45 Выбарчага кодэксу, не распаўсюджваецца Закон “Аб масавых мерапрыемствах”. Гэтая думка грунтавалася на тым, што ў ч.1 арт. 45 Кодэксу сказана, што грамадзянам, палітычным партыям, грамадзкім аб’яднаньням, працоўным калектывам, давераным асобам кандыдатаў у прэзідэнты, у дэпутаты, ініцыятыўным групам, якія праводзяць агітацыю, прадастаўляецца права свабоднага і ўсебаковага абмеркаваньня праграмаў кандыдатаў, іх палітычных, дзелавых і асабістых якасьцяў, правядзеньня агітацыі на сходах, мітынгах, у сродках масавай інфармацыі, а таксама падчас сустрэчаў з выбаршчыкамі. Гэтая норма артыкулу прадугледжвала свабоднае агітаваньне на сходах, мітынгах, сустрэчах з выбаршчыкамі. Варта зьвярнуць увагу: заканадаўца не прадугледжваў, што дадзеныя мерапрыемствы рэгулююцца заканадаўствам аб масавых мерапрыемствах. Гэтая думка падмацоўваецца ч.6 дадзенага артыкулу, дзе пазначана, што кандыдаты праводзяць сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі на сходах ці ў іншай зручнай для выбаршчыка форме. Гэта яшчэ раз падкрэслівае, што адзіным крытэрам пры правядзеньні агітацыі зьяўляецца зручнасьць для выбаршчыка, а не рашэньні мясцовага органу ўлады. Асноўным аргументам зьяўляецца норма ч.4 гэтага артыкулу, якая рэгулюе правядзеньне агітацыі падчас рэферэндумаў. У гэтай частцы заканадаўца наўпрост прадугледзеў, што правядзеньне сустрэчаў з выбаршчыкамі, публічнае абмеркаваньне пытаньняў, праектаў рашэньняў, якія выносяцца на рэферэндум, ажыцця ўляецца ў адпаведнасьці з заканадаўствам, якое рэгулюе правядзеньне масавых мерапрыемстваў. Такім чынам, асобна прадугледжана, што правядзеньне масавых мерапрыемстваў рэгулюецца сьпецыяльным заканадаўствам толькі пры правядзеньні рэферэндумаў. Заканадаўца гэта асобна падкрэсьліў, правёўшы мяжу паміж агітацыяй падчас выбараў і падчас рэферэндуму. Любы юрыст, які хоць крыху знаёмы з тэорыяй права, скажа, што ў выпадку, калі заканадаўца ўводзіць сьпецыяльнае абмежаваньне толькі ў дачыненьні да рэферэндуму – гэта значыць, што яно вычарпальна распаўсюджваецца толькі на яго.

Трэба адзначыць, што органы ўлады менавіта так і трактавалі дадзеную норму пасьля ўступленьня ў дзеяньне Выбарчага кодэксу — падчас правядзеньня выбараў у Палату прадстаўнікоў у 2000 годзе. Тады апазіцыйныя актывісты праводзілі сустрэчы з выбаршчыкамі свабодна ў зручнай для выбаршчыкаў форме. Падчас той выбарчай кампаніі людзі затрымліваліся выключна за заклікі да байкоту.

Усё зьмянілася падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001 году. Цэнтральная камісія выдала пастанову, дзе ўказвалася, што ўсе агітацыйныя мерапрыемствы рэгулююцца заканадаўствам аб масавых мерпрыемствах. Такім чынам была закладзеная практыка падмяняць закон пастановамі Камісіі, і гэта паўтаралася падчас усіх наступных выбарчых кампаніяў розных узроўняў. Дзеяньні Камісіі неаднаразова абскарджваліся дэмакратычнымі кандыдатамі, таму, верагодна, каб паставіць кропку ў гэтай спрэчцы, пазіцыя Цэнтральнай камісіі ўрэшце рэшт знайшла замацаваньне ў законе.

## "Пасткі" ў новай рэдакцыі Закону

Першае пытаньне: калі зьяўляецца суб'ект, які мае права зьвярнуцца з заявай аб правядзеньні мерапрыемства ў органы мясцовай ўлады? У выпадку, калі кандыдат атрымлівае права на падачу заявы толькі пасьля рэгістрацыі, тады ён губляе 5 дзён агітацыі, чакаючы адказу мясцовай улады. Трэба ўлічваць, што ў сярэднім агітацыйны перыяд у Беларусі складае 25 дзён, таму страта часу, безумоўна, адмоўна адаб'ецца на магчымасьці кандыдатаў сустракацца з выбаршчыкамі падчас пікетаў ці мерапрыемстваў іншага фармату. Да таго ж: ці захаваецца права для звычайных грамадзянаў, палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў падаваць заявы на правядзеньне агітацыйных мерапрыемстваў? Згодна з Выбарчым кодэксам, усе гэтыя суб'екты маюць права агітаваць, але якой будзе практыка – пакуль невядома.

Па-другое, зыходзячы з таго, што ўсё, акрамя тэрмінаў падачы заяваў і адказаў на іх, рэгулюецца нормамі закону "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь", улады могуць дазволіць правядзеньне агітацыйных мерапрыемстваў толькі ў сьпецыяльна вызначаных месцах. Такім чынам, можа атрымацца так, што кандыдат, які балатуецца, напрыкалад, у акрузе Заводзкага раёну Менску, будзе накіраваны на плошчу Бангалор, дзе, безумоўна, у яго невялікія шанцы сустрэць свайго выбаршчыка. А зараз у большасьці гарадоў краіны ёсьць свае "Бангалоры". Фармальна гэта будзе законна, бо заканадаўца не абавязаў органы ўлады даваць дазволы на правядзеньне агітацыйных мерапрыемстваў на тэрыторыі неабходнай акругі. Застаецца спадзявацца на здаровы сэнс і спасылацца на норму Кодэксу, што кандыдаты праводзяць мерапрыемствы ў зручнай для выбаршчыка форме.

Па-трэцяе, у адпаведнасьці з 6 арт. Закону "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь", павінны быць аплочаныя паслугі міліцыі, хуткай дапамогі, камунальных службаў па ўборцы тэрыторыі, дзе праходзіць масавае мерапрыемства. Пакуль незразумела, з якіх сродкаў праводзяцца гэтыя выплаты. Калі будзе прынятае рашэньне, што за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца для правядзеньня агітацыі з дзяржаўнага бюджэту, то іх ня хопіць на правядзеньне нават маленькага пікету.

## Новае ў Выбарчым кодэксе

Наступныя зьмены датычаць непасрэдна Выбарчага кодэксу. Спынімся на асноўных з іх.

1. Зьмена, унесеная ў арт.13, прадугледжвае, што ў якасьці назіральнікаў ад палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў могуць быць вылучаныя толькі сябры (члены) такіх аб'яднаньняў, а не іх прадстаўнікі. Паколькі партыі і грамадзкія аб'яднаньні і так вылучалі ў абсалютнай большасьці сваіх сяброў, то гэтае новаўвядзеньне можа быць ахарактарызаванае як фармальнае.

2. Істотная зьмена ўнесеная ў арт.21 і датычыць парадку азнаямленьня са сьпісамі выбаршчыкаў. Зыходзячы з ранейшай рэдакцыі, выбаршчыку за 15 дзён да выбараў прадастаўлялася магчымасьць азнаёміцца з агульным сьпісам выбаршчыкаў. На практыцы гэтае права абмяжоўвалася палажэньнямі "Метадычных рэкамендацыяў для працы ўчастковых камісіяў", выдадзеных Цэнтральнай камісіяй. Нягледзячы на тое, што "рэкамендацыі" — гэта не пастановы, для камісіяў яны фактычна насілі абавязковы характар і няўхільна выконваліся. Атрымлівалася, што насуперак нормам Выбарчага кодэксу, выбаршчык мог даведацца толькі тое, ці ўнесены ён сам ў сьпіс выбаршчыкаў. Цяпер ранейшая практыка замацаваная ў артыкуле Выбарчага кодэксу. Такім чынам, засакрэчваньне сьпісу выбаршчыкаў, якое раней ажыцьцяўлялася выбарчымі камісіямі ў парушэньне закону, зараз будзе адбывацца на законных падставах. Гэта дазваляе любым чынам, зыходзячы з патрэбаў улады, маніпуляваць колькасьцю выбаршчыкаў на ўчастку: павялічваць ці памяншаць гэтую колькасьць, свабодна дапаўняць сьпісы "мёртвымі душамі" ці не ўключаць у сьпісы тых, хто на працягу апошніх выбараў не прымаў у іх удзелу і г.д. Такім чынам можна лёгка падагнаць яўку пад свае патрэбы. Безумоўна, уведзеная норма Кодэксу не адпавядае прынцыпам празрыстасьці выбараў і галоснасьці працы выбарчых камісіяў.

3. Зьмены ў ч. 2 арт. 35 Кодэксу непасрэдна датычаць парадку вылучэньня прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў. У новай рэдакцыі падрабязна прапісана, што ў выбарчыя камісіі маюць права вылучаць сваіх сяброў толькі тыя арганізацыйныя структуры партыяў і аб'яднаньняў, якія маюць ніжэйстаячыя структуры. Істотна зьмяніўся парадак фармаваньня ўчастковых выбарчых камісіяў. Так, у ранейшай рэдакцыі правам вылучэньня прадстаўнікоў ва ўчастковыя выбарчыя камісіі валодалі першасныя структуры партыяў і аб'яднаньняў, якія маглі вылучаць сваіх прадстаўнікоў у гарадзкія (у гарадах раёнага падпарадкаваньня), пасялковыя, сельскія і ўчастковыя выбарчыя камісіі. Такая норма дазваляла суполкам партыяў і аб'яднаньняў вылучаць ва ўсе вышэйназваныя выбарчыя камісіі. Згодна з новай рэдакцыяй артыкулу, суполкі могуць вылучаць сваіх прадстаўнікоў выключна ва ўчастковыя камісіі таго ўчастку, на тэрыторыі якога зарэгістраваная суполка. Гэта значыць, што суполкі пазбавіліся права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у гарадзкія камісіі, а таксама ў іх захавалася права вылучэньня толькі ў адну камісію на тэрыторыі таго ўчастку, дзе ў яе ёсьць юрыдычны адрас. Гэтыя зьмены з пункту гледжаньня ўлады заканамерныя. Так, пасьля кампаніі па ліквідацыі юрыдычных адрасоў партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў, гэтыя суб'екты маюць невялікую легальную геаграфію сваёй дзейнасьці. Таму ствараецца натуральная і цалкам законная сітуацыя: няма вылучэньня, няма і прадстаўнікоў партыяў, аб'яднаньняў у камісіях. Няма суполак — няма і праблемаў. Гэта адразу ж адбілася на фармаваньні камісіяў падчас сёлетніх выбараў у мясцовыя Саветы, калі апазіцыйныя партыі здолелі вылучыць агулам толькі 120 прадстаўнікоў.

4. Зьмены ў арт. 45 Выбарчага кодэксу па-новаму рэгулююць парадак правядзеньня агітацыі. Так, ч. 7 новай рэдакцыі артыкулу дазваляе пры вызначэньні памяшканьняў для правядзеньня сустрэчаў з выбаршчыкамі кіраўнікам арганізацыяў прадастаўляць іншыя памяшканьні, акрамя тых, якія вызначаныя выбарчымі камісіямі. На першы погляд, гэта станоўчая зьмена, бо яна дазваляе па дамове з адміністрацыямі памяшканьняў павялічваць магчымасьць правядзеньня агітацыйных сустрэчаў. Але ж гэтая зьмена мае і засьцярогі. Так, з яе не вынікае, што пры такіх дазволах па-за рашэньнямі камісіі будзе дзейнічаць прынцып роўнасьці ўсіх кандыдатаў. Можа атрымацца так, што кандыдатам ад апазіцыі будзе прапаноўвацца абмежаваная камісіямі колькасьць сустрэчаў з выбаршчыкамі ў маленькіх нязручных памяшканьнях, а кандыдаты ад улады будуць карыстацца зусім іншымі магчымасьцямі.

5. Яшчэ адна зьмена, на якую варта зьвярнуць увагу – гэта ў ч. 9 арт. 45. Яна датычыць новых патрабаваньняў да дадзеных, якія павінны быць пазначаныя пры вырабе агітацыйнай прадукцыі. У папярэдняй рэдакцыі было ўказана, што агітацыйныя друкаваныя матэрыялы пры іх вырабе не патрабуюць сьпецыяльнага дазволу. Такія матэрыялы павінны толькі ўтрымліваць інфармацыю аб арганізацыях ці асобах, якія адказныя за іх выраб, а таксама аб накладзе гэтых матэрыялаў. У новай рэдакцыі фактычна адмененае права вырабу матэрыялаў без сьпецыяльнага дазволу. Згодна з новай рэдакцыяй, агітацыйныя матэрыялы павінны ўтрымліваць назву і адрас арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), нумар ліцэнзіі на паліграфічную дзейнасьць, дату яе выдачы, тыраж і нумар заказу. Такім чынам, улічваючы кантроль над арганізацыямі, якія маюць ліцэнзію на паліграфічную дзейнасьць, улады максімальна ўскладнілі магчымасьці вырабу друкаванай прадукцыі.

6. У арт. 46 Кодэксу ўнесены шэраг зьменаў, якія датычаць выкарыстаньня СМІ ў агітацыйных мэтах. Так, была ўведзеная новая ч. 5, якая прадугледжвае, што праграмы кандыдатаў могуць быць зьмешчаныя толькі ў тых СМІ, якія вызначаныя Цэнтральнай камісіяй, што фактычна забараняе кандыдатам зьмяшчаць свае праграмы ў незалежных СМІ.

7. Артыкул 49 Кодэксу, у якім гаворыцца пра адказнасьць за парушэньні выбарчага закону, пашыраны ўвядзеньнем адказнасьці адносна прэтэндэнтаў у кандыдаты і іх ініцыятыўных групаў. Таксама ўведзеная адказнасьць за парушэньне роўнасьці ўсіх кандыдатаў. Прадугледжваецца безумоўнае зьняцьце кандыдата, калі ён выкарыстаў у мэтах агітацыі сродкі звыш тых, якія выдзеленыя з бюджэту для правядзеньня агітацыі.

7. Унесеныя таксама зьмены ў арт. 61 Кодэксу, які прадугледжвае парадак вылучэньня кандыдатаў. Так, у ранейшай рэдакцыі адной са зьвестак, якую трэба было падаваць у камісію пры рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, а потым пазначаць у падпісным лісьце, зьўлялася "прафесія". Зараз гэты тэрмін выключаны. Але ж менавіта інфармацыя аб прафесіі будучага кандыдата найбольш цікавіць выбаршчыка, бо ступень яго адукацыі зьўляецца адным з асноўных крытэрыяў пры прыняцьці рашэньня выбаршчыкам аб тым, ці ставіць за яго подпіс. У нашай сітуацыі, калі шматлікія актывісты апазіцыі маюць вышэйшую адукацыю і навуковыя ступені, але пазбаўленыя магчымасьці працаваць па сваёй прафесіі, для іх вельмі важна адлюстроўваць гэты характарызуючы момант падчас вылучэньня ў кандыдаты.

8. Дадатак у ч. 13 арт. 61 вызначае, што ў выпадку, калі з падпіснога ліста подпіс выключаны сябрам ініцытыўнай групы, такі подпіс ня ўлічваецца пры правядзеньні праверкі. Ранейшая рэдакцыя прадугледжвала, што такое выняцьце робіцца ў той форме, як гэта вырашае сябра ініцыятыўнай групы. Зараз жа неабходна такое выняцьце зрабіць пісьмова. Закон не тлумачыць, што маецца на ўвазе, ці пісьмова ў самім сьпісе выбаршчыкаў, як гэта практыкавалася раней, ці адмысловай заявай. Ня выключана, што гэты момант будзе акрэсьлены сьпецыяльнай пастановай Цэнтральнай камісіі.

9. Норма, якая рэгулюе парадак вылучэньня кандыдатаў палітычнымі партыямі (арт. 62), таксама зьмененая па аналогіі з вылучэньнямі ў камісіі. Магчымасьць вылучаць кандыдатаў маюць выключна тыя структуры, у якіх ёсьць ніжэйстаячыя структуры. Таксама новая норма забараняе вылучаць кандыдатаў першасным структурам партыі, хаця раней яны мелі такое права пры вылучэньні ў раённыя, гарадзкія (у гарадах з раённым дзяленьнем), пасялковыя, сельскія Саветы.

10. Артыкул 66 Кодэксу, які рэгулюе парадак падачы дакументаў аб вылучэньні кандыдатаў у дэпутаты, выкладзены ў новай рэдакцыі. Як пазітыўны момант трэба адзначыць, што ў артыкуле больш дасканала і падрабязна выкладзеная сама працэдура. Аднак гэты артыкул максімальна ўскладніў працэдуру вылучэньня кандыдатаў ад

*(Працяг на стар. 7)*

# Нават юрыст — бяспраўны

4 лістапада судзьдзя Сьветлагорскага раённага суда Натальля Белайчук абвясьціла прысуд па крымінальнай справе супраць Сяргея Ярашэвіча — ён прызнаны вінаватым у абразе судзьдзяў з Рагачову Уладзіміра Саламейчука і Мікалая Рубісава і пакараны двума гадамі папраўчых работаў з утрыманьнем у даход дзяржавы 20 адсоткаў заробку. Падставай дзеля крымінальнага перасьледу сп. Ярашэвіча паслужыў ягоны запіс у кнізе заўвагаў і прапановаў Рагачоўскага суда. Ён меў неасьцярожнасьць параўнаць рагачоўскіх судзьдзяў з судзьдзямі 1937 году, якія нібыта ўчыняюць судзілішча па прынцыпе: быў бы чалавек, а артыкул знойдзецца.

Сёлета ўвесну згаданыя рагачоўскія судзьдзі пачаргова разглядалі даволі блытаную крымінальную справу супраць Сяргея Ярашэвіча, абвінавачанага ў хуліганстве з нанясеньнем лёгкіх цялесных пашкоджаньняў былому супрацоўніку жлобінскай міліцыі. У апошняга з Ярашэвічам склаліся непрыязныя побытавыя дачыненьні. У Рагачоўскім судзе спадара Ярашэвіча аштрафавалі на 3 мільёны 100 тысячаў рублёў. Разьбіральніцтва і прысуд ён палічыў неаб'ектыўнымі, таму і зрабіў запіс у кнізе заўвагаў і прапановаў. У выніку — чарговая крымінальная справа і прысуд, прычым першы падобны ў краіне. Да гэтага часу, наколькі вядома, у Беларусі за запісы ў кнігах заўвагаў, уведзеных у кожнай установе на падставе ўказу кіраўніка дзяржавы, нікога да крымінальнай адказнасьці не прыцягвалі.

Судзьдзя Натальля Белайчук лічыць, што спадар Ярашэвіч пісьмова абразіў рагачоўскіх судзьдзяў пры ажыцьцяўленьні імі правасудзьдзя: "Нашыя грамадзяне такія рэчы іншым разам пішуць – і ў скаргах, і ў кнігах, дазваляюць сабе зашмат, пераходзяць на асобы. Ня згодны з прынятым рашэньнем, абскарджвай, як належыць, рашэньне. Навошта ж судзьдзю абражаць?"

Рашэньне Сьветлагорскага раённага суда былы судзьдзя і адвакат са Жлобіну Сяргей Ярашэвіч пракаментаваў Радыё Свабода наступным чынам: "У нас апраўдальных прысудаў не бывае. З сістэмай немагчыма змагацца. Сваім запісам у кнізе заўвагаў я паказаў факт таго, што ў нашай краіне могуць асудзіць невінаватага чалавека – ня простага, які далёкі ад юрыспрудэнцыі. Нават юрыста могуць прызнаць вінаватым, і ён бяспраўны, ён ня зможа даказаць сваю праўду. І я як бы стаў ворагам усёй сістэмы".

## Кацярыну Садоўскую пераводзяць у Гомельскую жаночую калонію

**Праваабаронцу Кацярыну Садоўскую, якую пакаралі зьняволеньнем на два гады за абразу Аляксандра Лукашэнкі, пераводзяць у Гомельскую жаночую калонію.**

**Кацярына Садоўская даслала ліст сваякам, датаваны 9 лістапада. Яна напісала, што адміністрацыя Менскага сьледчага ізалятару запатрабавала, каб жанчына напісала заяву з просьбай накіраваць яе адбываць пакараньне ў калонію.**

**Згодна з заканадаўствам, праваабаронцу мусяць трымаць у СІЗА, пакуль ня прыйдзе афіцыйны адказ з вышэйшай інстанцыі на касацыйную скаргу. 60-гадовая Кацярына Садоўская перанесла анкалагічную аперацыю за два месяцы да арышту і кепска сябе адчувае. Яна спадзявалася, што яе накіруюць на абсьледаваньне ў турэмны шпіталь.**

# Мэта – запалохаць

15 лістапада ў судзе Маскоўскага раёну г.Берасьця была разгледжаная адміністрацыйная справа Андрэя Шарэнды, Кацярыны Бельскай, Юрася Боўбеля, Анатоля Ярмака і Ганны Берсан. Справу разглядала судзьдзя Сянько Руслана Альбертаўна. Справа ўзбуджаная па ч.1 арт.167-1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях за парушэньне ўстаноўленага парадку правядзеньня мітынгаў, вулічных шэсьцяў і т.п. Фактам парушэньня было правядзеньне 16 кастрычніка акцыі, прысьвечанай Дню Салідарнасьці. На вуліцы былі затрыманыя некалькі чалавек, частка з якіх потым была прыцягнутая да адказнасьці. Рыхтаваў матэрыялы для перадачы ў суд супрацоўнік аддзелу аховы правапарадку і прафілактыкі старшы лейтэнант Аляксандр Тарасевіч, менавіта ён кіраваў сваімі калегамі, якія наведвалі, бралі тлумачэньні, складалі пратаколы і запрашалі моладзь у суд. Яны ж інфармавалі кіраўніцтва па месцы працы і вучобы актывістаў. Справу рыхтавалі ў сьпешным парадку за некалькі дзён ад 11 па 14 лістапада, відавочна, што з "прафілактычна-прэвентыўнай" мэтай – сарваць правядзеньне чарговага мерапрыемства апазіцыі 16 лістапада і запалохаць "неабыякавую" частку грамадзтва.

Суд быў прызначаны на 10 гадзінаў раніцы 15 лістапада, але пачаўся толькі ў 11. За гэты час супрацоўнікі суда і міліцыі спрабавалі "вызваліць" памяшканьне суда ад тых, хто прыйшоў падтрымаць маладых людзей. Але ў адказ на гэта ўсімі прысутнымі былі напісаны скаргі на імя старшыні суда.

У якасьці сьведкаў былі запрошаныя міліцыянты, якія затрымлівалі маладых людзей, і бачылі іх у апорным пункце. Такімі сьведкамі выступілі супрацоўнікі Маскоўскага РАЎС г. Берасьця капітан Марозаў І.А., маёр Сыч Р.А., Галавейка І.І. (апрануты па-цывільнаму), старэйшы лейтэнант Тарасевіч А.В.), міліцыянер Саўчын У.У. Сьведчаньні міліцыянтаў розьніліся, ніхто з іх дакладна ня мог распавесьці аб так званым "несанкцыянаваным мітынгу". Да таго ж, судзьдзя неаднаразова задавала "наводзячыя" пытаньні, на якія сьведкі ўсе роўна не маглі дакладна адказаць.

Заслухаўшы адвакатаў, судзьдзя без перапынку на разважаньні, абвесьціла пастанову аб накладаньні штрафа на кожнага абвінавачанага "на карысьць дзяржавы": Ярмак Анатоль – 30 базавых адзінак; Берсан Ганна – 20 б.а.; Боўбель Юрась – 20 б.а.; Бельская Кацярына – 20 б.а.; Шарэнда Андрэй – 50 б.а.


Фота byMedia.net
*Дзень Салідарнасьці ў Менску 16 лістапада 2006 г.*

# Трое сутак за "хуліганства"


Фота byMedia.net
*Андрэй Кусельчук.*

30 кастрычніка судзьдзя Кастрычніцкага раёну Горадні Андрэй Кавальчук разглядаў судовую справу Андрэя Кусельчука – дарадцы лідэра дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандра Мілінкевіча. Судовае паседжаньне цягнулася доўга і цяжка: тройчы аб'яўляліся перапынкі. Актывіста асудзілі на 3 сутак "за хуліганства". 29 кастрычніка на гарадзенскім аўтавакзале была затрыманая машына Кусельчука. Двое людзей у цывільным скруцілі рукі актывіста, адабралі ключы ад машыны і залезьлі ў яе. Потым адчынілі багажнік, паводзілі сябе груба, не прадстаўляючыся, адкуль яны і як іх прозьвішчы.

Андрэй Кусельчук павінен быў абараняцца сам, таму што яму не прадаставілі адвакатаў, аб дапамозе якіх ён прасіў. Паводле словаў А.Кусельчука, у ягонай справе ўсё парушана: пратакол адміністрацыйнага затрыманьня ня складзены, не растлумачаныя ягоныя правы і адсутнічае тлумачэньне, на якой падставе ён затрыманы. Спачатку яго вінавацілі за распаўсюд літаратуры, а потым, за ноч, зьмянілі на "дробнае хуліганства". Дарэчы, па гэтым артыкуле былі пасаджаны ў турмы амаль усе гарадзенскія актывісты з каманды Аляксандра Мілінкевіча падчас прэзідэнцкіх выбараў.

# Зноў пагроза закрыцьця

## Справа аб прыпыненьні дзейнасьці БХК аднаўленая

У Вярхоўным Судзе Беларусі аднаўленая справа аб прыпыненьні дзейнасьці Беларускага Хельсінскага камітэту. Праваабаронцы заяўляюць пра ціск беларускай дзяржавы на арганізацыі, якія бароняць людзей ад сваволі чыноўнікаў.

У Вярхоўным судзе Беларусі пацьвердзілі, што справа супраць Беларускага Хельсінскага камітэту аднаўленая.

Яшчэ ў чэрвені Мінюст хадайнічаў аб прыпыненьні дзейнасьці БХК на той падставе, што арганізацыя ня выплаціла 160 мільёнаў рублёў штрафаў і падаткаў з замежнай грашовай дапамогі. Аднак тады разгляд справы прыпынілі да разгляду скаргаў БХК. Праваабаронцы спрабавалі аспрэчыць, што яны мусяць выплочваць падаткі паводле праграмы TACIS. Галоўным аргументам у спрэчцы было ранейшае абяцаньне ўраду не абкладаць падаткамі гэтую дапамогу Еўрасаюзу грамадзкім арганізацыям.

У кастрычніку апошняя скарга БХК была адхіленая, і 1 лістапада Менскі гаспадарчы суд вырашыў канфіскаваць маёмасьць БХК, а Вярхоўны Суд аднавіў разгляд пазову Мінюсту аб прыпыненьні дзейнасьці арганізацыі. Выканаўчы дырэктар БХК Алег Гулак лічыць такое супадзеньне невыпадковым:

— З гэтага таксама можна ўбачыць, што ўсё рэжысуюць з адзінага цэнтру.

Міністэрства юстыцыі ў сваім пазове да БХК прасіла судзьдзяў прыпыніць дзейнасьць арганізацыі да 1 верасьня, але пакуль справа адкладалася, час прыпыненьня мінуў. На які тэрмін цяпер просяць чыноўнікі Мінюсту прыпыніць дзейнасьць праваабарончай арганізацыі? Высьветліць гэта не ўдалося. Начальнік управы грамадзкіх арганізацыяў Мінюсту Алег Сьліжэўскі адмовіўся падаваць нейкія зьвесткі.

Толькі за два мінулыя гады з ініцыятывы Мінюсту закрылі каля пяцідзесяці грамадзкіх арганізацыяў, у тым ліку некалькі праваабарончых: праваабарончы цэнтр “Вясна”, "Прававу дапамогу насельніцтву", "Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў" ды іншыя.

Беларускія праваабаронцы кажуць ня проста пра ціск асобных чыноўнікаў, а пра каардынаваную палітыку на дзяржаўным узроўні. Гэтую думку падзяляе былы дэпутат, а цяпер праваабаронца Людміла Гразнова:

Яны аднаўляюць сістэму, да якой прызвычаіліся, — аўтарытарную, таталітарную, калгасную. І ўсё падганяюць пад тыя схемы. У 1970-я гады ж не было ніякіх праваабарончых арганізацыяў, апазіцыйных партыяў.

Справу БХК будзе разглядаць судзьдзя Ігар Бабкоў. Папярэдняе паседжаньне ён прызначыў на 13 лістапада.

# Сяргей Скрабец — на волі


*Сяргей Скрабец на прэс-канферэнцыі.*

(Пачатак на стар. 1)

адмянілі любыя палёгкі і мне, і яму. Увялі жорсткі рэжым. Лісты з волі ішлі доўга. А нашыя лісьмы – нават невядома, ці дайшлі яны. І праверыць ніхто ня можа. Гэта не кантралюецца нікім і ніяк. Заўсёды можна зваліць на “Белпошту”. Ды што можна казаць, калі нават адваката і жонку да яго не пускаюць?..

Ірына Казуліна, якая таксама ўдзельнічала ў канферэнцыі, расказала, што калі яна прынесла мужу ў калонію коўдру, варта адмовіла ў перадачы, спаслаўшыся на тое, што ня маюць права прымаць коўдру і быццам у гэтым выпадку яны дзейнічаюць у межах закону. Маўляў, спальнай бялізнай калонія забясьпечвае вязьняў сама. Ад жонкі Казуліну перадалі толькі працоўнае адзеньне.

На думку Сяргея Скрабца, Аляксандр Казулін будзе сядзець столькі, колькі пажадае прэзідэнт Беларусі. На пэўныя ільготы спадзявацца не даводзіцца.

Нагадаем, што самога Сяргея Скрабца 14 лютага 2006 году асудзілі на два з паловай гады. Яго абвінавацілі ў выманьваньні крэдытаў.

Сваю віну былы дэпутат не прызнаў. Праваабаронцы лічаць прысуд былому дэпутату палітычна матываваным. Калі быў дэпутатам, палітык праводзіў галадоўкі пратэсту з патрабаваньнем вызваліць палітвязьняў і занесьці зьмены ў выбарчае заканадаўства, а таксама зьяўляўся арганізатарам акцыі пратэсту, прысьвечанай канцу 10-гадовага кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі ў ліпені 2004 года.

У кастрычніку Сяргей Скрабец быў амніставаны і тэрмін яго пакараньня скараціўся на адзін год.

## Адмяніць "палітычныя" артыкулы

Міжнародны Хельсінскі камітэт (МХК) заклікае беларускія ўлады адмяніць артыкул 193-1 Крымінальнага кодэксу РБ (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Аб гэтым паведамляецца ў заяве прэс-службы МХК. “Гэты артыкул, па якім быў асуджаны лідэр Маладога Фронту Зьміцер Дашкевіч, а таксама актывісты арганізацыі “Партнёрства”, парушае Канстытуцыю Беларусі і права грамадзянаў на свабоду асацыяцыяў, – гаворыцца ў заяве. – Гэты артыкул дазваляе перасьлед у судовым парадку сяброў незарэгістраваных арганізацыяў, нават калі яны не вядуць дзейнасьць, накіраваную супраць дзяржавы або грамадзкай бясьпекі, а таксама не парушаюць грамадзкі парадак або правы іншых грамадзянаў”.

У сваёй заяве МХК рэзка асуджае судовы перасьлед грамадзкіх і палітычных актывістаў Беларусі.

# Пра міжнародныя стандарты — забудзьце

(Пачатак на стар. 4-5)

палітычных партыяў. Так, у старой рэдакцыі прадугледжвалася, што разам з іншымі дакументамі падаецца даведка аб наяўнасьці ніжэйстаячай структуры, якая пацьвярджае права на вылучэньне кандыдата ў адпаведны Савет ці акругу пры выбарах у Палату прадстаўнікоў, а таксама даведка, што вылучаны кандыдат зьяўляецца сябрам партыі. Зараз жа падкрэсьлена, што даведка аб наяўнасьці структуры выдаецца абласным упраўленьнем юстыцыі. Сэнс гэтай праўкі можна растлумачыць толькі абцяжарваньнем працэдуры вылучэньня, бо як старая так, і новая рэдакцыя прадугледжваюць падачу пасьведчаньня аб рэгістрацыі ніжэйстаячай структуры. Пасьведчаньне аб дзяржаўнай рэгістрацыі (пастаноўцы на ўлік) зьяўляецца дакументам строгай адказнасьці, яно выдаецца рэгіструючым органам і ўтрымлівае неабходныя зьвесткі аб арганізацыйнай структуры.

Таксама трэба адзначыць, што слова “даведка” са старой рэдакцыі Кодэксу замененае выразам “копія дакументу”, які пацьвярджае сяброўства ў партыі. Закон “Аб палітычных партыях” не ўтрымлівае заканадаўча замацаванага парадку ўліку сяброў, акрамя таго, што такі парадак мусіць быць прапісаны ў Статуце, а сяброўства павінна быць фіксаваным. Такім чынам, незразумела, пра якую копію дакументу ідзе гаворка ў зьмененай рэдакцыі. У старой рэдакцыі Выбарчага кодэксу запіс быў больш зразумелы. Раней сама палітычная партыя пацьвярджала, што вылучаная асоба зьяўляецца яе сябрам.

11. Артыкулам 95 Кодэксу практычна адмененыя выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў замест выбыўшых. У ранейшай рэдакцыі прадугледжвалася, што такія выбары адбываюцца ў чатырохмесячны тэрмін з моманту выбыцьця дэпутата. У новай рэдакцыі тэрмін правядзеньня выбараў прыбраны. Гэта можна растлумачыць жаданьнем паменшыць матывацыю адкліканьня дэпутатаў мясцовых Саветаў, бо навошта праводзіць такую працэдуру, калі правядзеньне выбараў іншых дэпутатаў не рэгламентавана і пад пытаньнем.

12. Зьмены ў арт. 112 Кодэксу рэгулююць парадак правядзеньня мясцовага рэферэндуму. Зараз забаронена выносіць на рэферэндум пытаньні, якія ўрэгуляваны заканадаўчымі актамі Беларусі. Відаць, улады прааналізавалі не даведзеную да завяршэньня кампанію дэмакратычных партыяў па правядзеньні мясцовага рэферэндуму ў Менску па пытаньні перайменаваньня прасьпектаў і вуліцаў сталіцы (згодна з указам А. Лукашэнкі ў 2005 годзе). Зараз такі рэферэндум проста немагчымы, грамадства на мясцовым узроўні пазбавілася права адмяняць рашэньні, уведзеныя заканадаўчымі актамі.

Аналіз асноўных зьменаў і дапаўненьняў у Выбарчы кодэкс паказвае, што яны не наблізілі выбарчае заканадаўства Беларусі да міжнародных стандартаў, не стварылі празрыстай дэмакратычнай працэдуры правядзеньня выбараў, якая б выклікала давер ва ўсіх суб’ектаў. У сваёй большасьці яны накіраваныя на пагаршэньне ўмоваў правядзеньня выбарчых кампаніяў і ня ўлічваюць рэкамендацыяў дэмакратычных партыяў, незалежных экспертаў і міжнароднай супольнасьці.

# Летась – двое, сёлета ужо пяцёра...

## Беларусь сёньня – адзіная краіна Еўропы, дзе практыкуецца сьмяротнае пакараньне

Старшыня Вярхоўнага суда Беларусі Валянцін Сукала паведаміў агенцтву "Інтэрфакс", што за першае паўгодзьдзе 2006 году ў Беларусі былі вынесеныя пяць прысудаў да найвышэйшай меры пакараньня – сьмяротнай кары. Летась сьмерцю пакаралі толькі двух чалавек.

Валянцін Сукала адзначыў, што "гэта было выклікана ростам серыйных забойстваў, калі пазбаўляюцца жыцьця два, тры, чатыры чалавекі. Вядома, у гэтым выпадку і грамадзтва, і суды трапляюць у вельмі складаную сітуацыю, бо тут пажыцьцёвае зьняволеньне таксама зьяўлялася б несуразьмераным зробленаму".

Старшыня Вярхоўнага суда дадаў, што "гэтыя пяць выпадкаў, калі ўжо нельга было знайсьці ніякіх зьмякчальных абставінаў для неўжыцьця сьмяротнай кары".

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч так ацэньвае сітуацыю з прымяненьнем вышэйшай меры пакараньня ў Беларусі:

"У беларускім Крымінальным кодэксе санкцыю ў выглядзе сьмяротнага пакараньня прадугледжваюць ня толькі артыкулы, зьвязаныя з забойствам, але і шэраг злачынстваў, якія адносяцца да разьдзелу кодэксу – злачынства супраць дзяржавы: шпіянаж, здрада радзіме. Таксама гэта тычыцца вайсковых злачынстваў, але санкцыя па такіх злачынствах не выкарыстоўваецца ў мірны час.

Калі інстытут сьмяротнага пакараньня легальна існуе ў дзяржаве, то няма ніякай гарантыі, што ён ня будзе выкарыстоўвацца на практыцы. Да прыкладу, нават справа Паўла Красоўскага, якога паспрабавалі абвінаваціць у сур'ёзных злачынствах, санкцыя паводле якіх прадугледжвала сьмяротнае пакараньне, прымушае задумацца над гэтым. Да таго ж, пры нашай судовай сістэме нельга сьцьвярджаць, што судзьдзі ня робяць памылак. Можна згадаць і справу Міхасевіча, па якой было незаконна асуджана 12 чалавек. А адзін з іх – невінаваты – быў расстраляны. І ніхто ня можа даць гарантыяў, што прысуды, якія выносяцца цяпер, – законныя.

Для краінаў, якія ўступаюць у Еўрасаюз, да прыкладу, адмена сьмяронага пакараньня – адна з абавязковых умоваў. А ў Расіі і Украіне абвешчаны мараторый на ўвядзеньне сьмяротных пакараньняў. Таму праваабарончыя арганізацыі Беларусі выступаюць за ўвядзеньне мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Тым больш, што Беларусь сёньня застаецца адзінай краінай у Еўропе, дзе рэальна практыкуецца вышэйшая мера пакараньня".

## Ахвяры гвалту – жанчыны

***Міжнародная праваабарончая арганізацыя "Amnesty International" прыйшла да высновы, што ў Беларусі тысячы жанчынаў становяцца ахвярамі гвалту ў сям'і і яны дрэнна юрыдычна абароненыя***

**У справаздачы міжнароднай праваабарончай арганізацыі "Amnesty International", якая была абнародаваная 8 лістапада, адначаецца, што, паводле афіцыйных крыніцаў у Менску, у Беларусі летась былі зарэгістраваныя каля трох тысячаў выпадкаў гвалту над жанчынамі ў сям'і.**

**Аднак, на думку праваабаронцаў, рэальная колькасьць ахвяраў хатняга гвалту значна большая, бо няма дакладных дадзеных па ўсёй краіне.**

**У краіне дзейнічаюць толькі тры дзяржаўныя крызісныя цэнтры для жанчынаў, якія патрапілі ў бяду. Яны недастаткова фінансуюцца і не забясьпечваюць сапраўднай дапамогі жанчынам.**

**Дзейсную дапамогу маглі б аказаць няўрадавыя арганізацыі, аднак, магчымасьці іх працы ў Беларусі абмежаваныя, – гаворыцца ў справаздачы.**

**"Amnesty International" адзначае, што ўрад зрабіў пэўныя крокі ў вырашэньні праблемы, але яны пакуль неадэкватныя.**

## Антысемітызм – недапушчальны

Амбасада Ізраілю выступіла з заявай у сувязі з учыненьнем у Менску двух актаў вандалізму антысеміцкага характару

У канцы мінулага тыдня на фасадзе будынку, дзе разьмешчаны Ізраільскі інфармацыйна-культурны цэнтр, былі намаляваныя свастыкі і зробленыя надпісы "Бі жыдоў". На абеліску комплексу памяці габрэяў – ахвяраў II сусьветнай вайны "Яма" – была таксама нанесеная свастыка, побач з абеліскам раскіданыя ўлёткі, якія заклікаюць да "бескампраміснай барацьбы" з "юдаізмам і масонствам – ворагамі і здраднікамі айчыны". Улёткі падпісаныя "Фронтам арыйскага супраціву Белая Русь".

"Спадзяемся, што беларускія ўлады прымуць самыя сур'ёзныя меры дзеля выяўленьня, затрыманьня і пакараньня вінаватых. Амбасада ўжо давяла інфармацыю пра тое, што адбылося, да ведама Міністэрства замежных справаў Беларусі. Амбасадар Ізраілю папрасіў аб тэрміновай сустрэчы з намесьнікам міністра замежных справаў, які курыруе нашыя двухбаковыя адносіны", – гаворыцца ў прэсрэлізе амбасады.

Амбасада Ізраілю таксама спадзяецца, што беларускія сродкі масавай інфармацыі разгорнуць шырокую кампанію пратэсту супраць "падобных зьяваў, недапушчальных у цывілізаваным і дэмакратычным грамадзтве", паведаміла прэс-служба Хартыі-97.

## Правакацыя супраць Саюзу палякаў

Старшыня непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў Анжаліка Борыс 13 лістапада была дапытаная ў гарадзенскай абласной управе КДБ. Анжаліка Борыс зьяўляецца сьведкай у крымінальнай справе аб кантрабандзе наркотыкаў. Як паведаміла Радыё Свабода, допыт працягваўся больш за чатыры гадзіны. Спачатку да Анжалікі Борыс не хацелі дапусьціць адваката, і яна адмовілася адказваць на пытанньні. Тады адвакат Уладзімір Кісялевіч быў дапушчаны на допыт. Пасьля гэтага старшы сьледчы па асабліва важных справах маёр Віктар Ражко заявіў, што яны хочуць здымаць допыт на відэа. Сп. Борыс не пагадзілася, сказаўшы, што раней не аднойчы такія відэазапісы выкарыстоўвала потым беларускае тэлебачаньне ў сваіх фільмах. Аднак відэакамеру ўключылі, і Анжаліка Борыс адмовілася гаварыць. Яна такім чынам дамаглася, каб яе перасталі здымаць. Сьледчага цікавіла шырокае кола пытаньняў, у тым ліку – дзейнасьць СПБ, яго фінансаваньне, кантакты за мяжой.

Анжаліка Борыс адмовілася падпісваць паперу аб тым, што яна ня будзе распавядаць пра зьмест допытаў па-за сьценамі КДБ.

У першай палове дня на допыце ў КДБ быў кіроўца спадарыні Борыс Анджэй Лісоўскі, у машыне якога знайшлі наркотык. Яшчэ раней ён быў названы падазраваным у гэтай крымінальнай справе. У яго ўзялі падпіску аб нявыезьдзе і забралі пашпарт. Але сп.Лісоўскі адмовіўся даць падпіску аб тым, што ён ня будзе разгалошваць зьмест допытаў.

Нагадаем, што 29 кастрычніка на КПП "Прывалка" на беларуска-літоўскай мяжы быў затрыманы аўтамабіль А.Лісоўскага, якім ён кіраваў. У машыне былі двое пасажырак, адна з іх — Анжаліка Борыс. Мытнікі знайшлі ў аўтамабільным люстэрку невядомы парашок, які потым аказаўся амфетамінам.

4 лістапада ў Горадні адбылося паседжаньне Галоўнай рады Саюзу палякаў, не прызнанага ўладамі, у якім удзельнічаў 21 сябра Рады і кіраўнікі сямі аддзелаў СПБ з розных гарадоў Беларусі. На паседжаньні была прынятая заява, у якой выказваецца рашучы пратэст супраць парушэньня правоў польскай меншасьці і перасьледу сяброў Саюзу палякаў. Як палітычная правакацыя ацэньваецца тое, што ў машыну старшыні СПБ Анжалікі Борыс быў падкінуты амфетамін, калі яна вярталася з Вільні з паседжаньня агульнаеўрапейскай арганізацыі польскіх таварыстваў. Гэтая правакацыя накіраваная супраць СПБ і яе сяброў, гаворыцца ў заяве.

Галоўная рада зазначае, што будзе бараніць правы ўсіх палякаў, сяброў сваёй арганізацыі — інфармаваць міжнародную грамадзкасьць, а таксама наладжваць акцыі пратэсту. Сябры Галоўнай рады патрабуюць, каб беларускія ўлады прызналі Саюз палякаў на чале з А.Борыс і вярнулі яму маёмасьць.

Заява накіраваная польскім і беларускім уладам.

Як вядома, паводле факту знойдзенага ў машыне А.Борыс амфетаміну (паўтара грама) распачатая крымінальная справа паводле часткі 2 арт. 228 — аб кантрабандзе наркотыкаў.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах. Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.

Адрас рэдакцыі: 220012 Менск, а/с 9.